ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 177 (1446) | НЯДЗЕЛЯ, 2 жніўня 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 .
6 месяцаў . . . 1 р. 80 .
1 год . . . 3 р. 60 .
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 33
Тэлефоны: рэдактара—7-25,
сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Кошт асобнага №—2 кап.

ОРГАНІЗАВАЦЬ АДЫХОДНІЦТВА

Тав. Сталін у сваёй апошняй прамове на нарадзе гаспадарнікаў устанаўліваючы шэсьць новых задач пры новай абстаноўцы, сказаў: „з гэтага выцякае, па-першае, тое, што нельга больш разьлічваць на самацёк рабочай сілы. Значыць, ад „політыкі" самацёку трэба перайсьці да політыкі організаванага набору рабочых для прамысловасьці. Але для гэтага існуе адзін толькі шлях—шлях дагавораў гаспадарчых організацый з колгасамі і колгасьнікамі".

Месяц таму назад у друку была апублікавана пастанова ЦВК СССР аб адыходніцтве. Недахоп рабочае сілы па раду галін нашай прамысловасьці, асабліва па торппрамысловасьці, ставіў перад намі задачу шырокай популярызацыі сярод колгасьнікаў і аднаасобных мас сялянства гэтага закону.

Пастанова ўраду вслабаняе колгасьнікаў адыходнікаў ад усякіх адлічэньняў ад заработку ў абагулены фонд колгасу. Адыходнікі, побач з усімі колгасьнікамі, маюць права атрымаць па ўстаноўленым цэнам продукты з колгаснага ўраджаю, яны аслабаняюцца ад абкладаньня адзіна-сельска-гаспадарчым падаткам за неабагуленую частку маемасьці, незалежна ад заработку адыходніка і г. д.

Гаспадарчыя-ж організацыі павінны забясьпечыць адыходнікаў жыльлём, аплаціць выдаткі на пераезду к месцу працы, сутачныя за час знаходжаньня адыходнікаў у дарозе.

Задача пролетарскай грамадзкасьці у прыватнасьці комсамолу зьмяшчаецца у тым, каб на падставе давядзеньня да кожнага колгасьніка, да кожнага аднаасобніка гэтай пастановы, організаваць плянавую сталую вярбоўку рабочае сілы для найважнейшых галін прамысловасьці.

Аднак, да гэтага часу мы ня маем дастатковага прыліву новай рабочай сілы. Пастанова ЦК Усе КП(б) і СНК аб вярбоўцы колгасьнікаў і аднаасобнікаў на торпрасправоўкі, на падставе популярызацыі пастановы аб адыходніцтве ня выканана.

Вярбоўка рабочае сілы да гэтага часу мае рад недахопаў. На некаторых раёнах вярбуючыя організацыі Наркомпрацы складаюць дагаворы не непасрэдна з колгасамі а з райколгассаюзамі, а ў некаторых раёнах праводзіцца яўнае адміністраваньне у справе вярбоўкі рабочае сілы. Так, Сьвіслаўскі райколгассаюз вербаваў колгасьнікаў на торпзаводы шляхам адміністрацыйнага загаду аб дасылцы адпаведнай колькасьці колгасьнікаў, не заключыў дагавору з колгасамі.

Такім чынам першы месяц рэалізацыі гэтай важнейшай пастановы даў нездавальняючыя вынікі.

Зараз задача ў тым, каб у бліжэйшыя дні давесьці да кожнага колгасьніка і аднаасобніка тыя ільготы, якія даюцца пастановай ЦВК. Комсамольскія організацыі гораду і вёскі павінны забясьпечыць хуткае вырашэньне гэтага пытаньня. Гэта па-першае.

Па-другое вярбуючыя органы у прыватнасьці Наркомпрацы павінны організаваць сваю працу такім чынам каб вярбоўку праводзіць на падставе спэцыяльных дагавораў з колгасамі.

На трэцяе на самых прадпрыемствах адыходнікам павінны быць створаны такія культурна-бытавыя і жыльлёвыя ўмовы, якія-б прывязвалі іх прыход у прамысловасьць і зьнішчылі-б цякучасьць.

Задача кожнай комсамольскай ячэйкі разгарнуць політмасавую работу ў кожным колгасе, ухожнай вёсцы давесьці да ведама пастановы аб адыходніцтве каб шырокія колы колгасных батрацка-бядняцкіх і серадняцкіх мас вёскі, ведалі, што адыходніцтва зьяўляецца шляхам да завяршэньня соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі.

У барацьбе за чырвоны плебісцыт

БЭРЛІН. 31. Адбыўся вялікі сход скліканы компартыяй у парадку падрыхтоўкі да ўсенароднага галасаваньня па пытаньню аб роспуску прускага ляндтагу. На сход быў зроблены напад аб'яднанага атраду паліцыі і членаў буржуазнай напалову вайсковай організацыі „Рэйхсбанэр" колькасьцю у 100 чалавек, на чале якой стаялі соцыял-дэмократы; нападам кіравалі 3 соцыял-дэмократычныя дэпутаты прускага ляндтагу і адзін з рэдактароў „Форвэртс".

Сыгнал да выступленьня быў пададзен пасьля прамовы тав. Гірша, калі ўжо выявілася спачуваньне многалікіх прысутных на сходзе соцыял-дэмократычных рабочых компартыі. Пасьля прамовы Гірша ўдзельнікі сходу засьпявалі „Інтэрнацыянал". Організаваныя соцыял-фашысцкія провакатары зацягнулі з свайго боку рэйсбанэраўскія песьні. Паміж рэвалюцыйнымі рабочымі і соцыял-фашысцкімі провакатарамі пачалася драка. Тады у справу умяшалася паліцыя, якая зрабіла чатыры стрэлы і пры дапамозе сяброў рэйхсбанэра заарыштавала 20 рабочых. У ліку арыштаваных знаходзіцца і тав. Гірш.

„Назваць Лігу нацый імпэрыялістычнай—тактычная памылка"

ВЕНА. 31. На конгрэсе 2 інтэрнацыяналу закончыліся спрэчкі па рэзолюцыі аб разброеньні.

У процівагу рэзолюцыі камісіі ангельскія незалежанцы, „бундаўцы" з Польшчы і польскія „незалежныя соцыялістыя" прапанавалі сваю рэзолюцыю, насычаную двудушнымі „радыкальнымі" фразамі, прызываючымі партыі 2-га інтэрнацыяналу „вытвараць рэволюцыйны націск на свае ўрады, каб перашкодзіць узьнікненьню вайны", а ў выпадку калі вайна будзе абвешчана, спыніць яе „шляхам зьвяржэньне капіталізму". Рэзолюцыя патрабуе таксама „барацьбы соцыял-дэмократычных партый усіх краін за разброеньне", прычым зусім не ўспамінае савецкі проэкт аб разброеньні.

Прадстаўнік ангельскай рабочай партыі Броквэй, абараняючы праланову меншасьці, адзначыў, што рэзолюцыя большасьці, якая перадае справу разброеньня Лізе нацый вызывае расчараваньне рабочых мас. Швэйцарац Шмідт прачытаў заяву, у якой швэйцарскія соцыял-дэмократы адхіляюць рэзолюцыю камісіі, як ствараючую ў рабочай клясе ілюзію, нібыта хочуць правесьці разброеньне праз Лігу нацый. Аднак, у інтарэсах адзінства, швэйцарская соцыялдэмократыя ўстрымліваецца да галасаваньня.

Рэнодэль лічыць, што назваць Лігу нацый імпэрыялістычнай—тактычная памылка, паслабляючая позыцыі соцыял-дэмократыі. Соцыял-дэмократы павінны ўзмацняць соцыялістычны ўплыў у Лізе нацый і дамагацца ўцягненьня Амэрыкі ў лігу. Рэнодэль прапануе запрасіць Савецкі Саюз, які ўдзельнічае ў падрыхтоўчай конфэрэнцыі па разброеньню, быць пасьлядоўным і ўступіць у Лігу нацый.

Пленум пераходзіць да галасаваньня рэзолюцыі па прынцыпу корпарацыйнасьці. Гэта значыць, па дэлегацыям. За рэзолюцыю камісіі падана 304 галасы, супроць—2 ангельскія незалежнікі, адзін польскі належнік. Швэйцарская дэлегацыя ад галасаваньня адмовілася.

ПА ТОЙ БОК МЯЖЫ

Фінансавы крызіс паглыбляецца

БЭРЛІН. 31. Муніцыпалітэт Гановэра паведамляе, што муніцыпальным служачым пэнсіі і дапамога будуць выплачаны 1-га жніўня толькі часткова. Муніцыпалітэт г. Кіля таксама паведамляе, што з прычыны цяжкога фінансавага становішча ён ня можа за адзін раз выплаціць у жніўні дапамогу. Муніцыпалітэтгораду Фішбэк (блізу Гамбурга) паведамляе, што 1-га жніўня будзе выплачана толькі трэцяя частка пэнсіі. У Брэмэне служачым выплачваецца 31 ліпеня толькі палова пэнсіі.

Забастоўка тэкстыльшчыкаў у Індыі

ЛЁНДАН. 29. Як паведамляюць з Бомбэю, 30 тысяч рабочых тэкстыльшчыкаў у Шаляпуры абвясьцілі забастоўку. Моцныя сілы паліцыі ахоўваюць тэкстыльныя фабрыкі і нясуць патрульную службу на тэрыторыі забастоўкі.

Бомбэйскія тэкстыльшчыкі у адозве к шаляпурскім тэкстыльшчыкам заявілі аб сваёй солідарнасьці з забастоўшчыкамі. Рабочыя адной з бомбэйскіх фабрык абвясьцілі забастоўку солідарнасьці. Бастуючыя рабочыя організавалі пікетоўку тэкстыльных фабрык.

МЕНСК У ДЗЕНЬ 1-га ЖНІЎНЯ

На масоўцы ў садзе „Профінтэрн" па цэхах заводаў і фабрык

* 31-га ліпеня ўвечары ў садзе „Профінтэрн" адбылася масоўка, прысьвечаная Міжнароднаму Чырвонаму дню.

* Даклад зрабіў тав. Кавальчук.

* Ад чэха-славацкай рабочай дэлегацыі, якая цяпер знаходзіцца на Беларусі, ад імя тысячы рабочых мэталя-апрацоўчай Карлавай гуты (Чэха-Славакія), у асобе дзесяткаў тысяч Менскіх пролетараў, прывітаў увесь пролетарыят Савецкага Саюзу сябра дэлегацыі тав. Верскі.

* На трыбуне амэрыканскі рабочы Гольдбэрг.

* Былы дэпутат сейму, політэмігрант Рак-Міхайлоўскі, апавядае аб зьдзеках польскіх фашыстых у турме.

* Агітбрыгада друкарні Сталіна перадае рапарт.

— У друкарні ахоплена 700 ч. ударніцтвам, існуе дзевяць гурткоў па вывучэньню тэхнікі сваёй справы. Друкарня акомсамолена на 100 проц., на заём падпісаліся на 105 проц. месячнага заработку, уведзен гаспадарчы разрахунак. Сталінцы ўзялі шэфства над аэродромам.

* Рапартаваў завод „Бальшавік".

* Ячэйка АСО фабрыкі „Кастрычнік" аддае рапарт.

* Ад менскага чыгуначнага вузла ітаў Сівіцкі.

* Ячэйка АСО фабрыкі „8-га сакавіка" расказвае аб сваіх дасягненьнях.

— Мы два дні адпрацуем на аэродроме. У нашым хэматрадзе 95 проц. жанчын.

* Ад заводу імя Варашылава—рапартаваў Лінкевіч.

* Пролетараў Менску прывітала дэлегацыя піонэраў зьлёту.

* * *

* Па цэхах заводу імя Варашылава праведзены мітынгі і гутаркі аб дню 1-га жніўня. 31-га ліпеня ўсе рабочыя організавана вышлі на масоўку ў сад „Профінтэрн".

Рабочыя „Варашылава" паслалі адозву працоўным Заходняй Беларусі і падшэфнай фабрыцы „Лянтэй Шнайдэр" у Лейпцыгу. Адозва заклікае рабочых Заходняй Беларусі і фабрыкі „Лянтэй Шнайдэр" 1-га жніўня выступіць масавай дэмонстрацыяй супроць падрыхтоўкі капіталістых да нападу на СССР.

* На заводзе „Комунар" 29 ліпеня адбыўся вечар, прысьвечаны Міжнароднаму Чырвонаму дню. Выступілі члены чэха-славацкай дэлегацыі рабочых.

* На заводзе „Бальшавік" у час падрыхтоўкі да 1-га жніўня асаблівая ўвага ўдзелена ўзмацненьню працы ячэйкі АСО. Праведзены перавыбары бюро ячэйкі АСО.

* На шчотачнай фабрыцы імя Крупскай з 25 па 31 ліпеня па ўсіх цэхах праводзіліся гутаркі з рабочымі аб задачах 1-га жніўня.

* У Доме колгасьніка з 1-га па 10-е жніўня адчынена выстаўка, прысьвечаная 17-й гадавіне імпэрыялістычнай вайны.

Другі ўсебеларускі зьлёт піонэраў

Зачыніўся ўсебеларускі зьлёт 3-га пакаленьня



* 30-га ліпеня піонэры-дэлегаты зьлёту разам з чырвонаармейцамі ў лягерах у Ждановічах правялі дзень абароназдольнасьці краіны.

* Узводамі па раёнах піонэры-дэлегаты наладзілі гутаркі з камандзірамі Чырвонай арміі на тэму, як навучаюцца і жывуць чырвоныя байцы

* Шляхам экскурсій піонэры азнаёміліся з жыцьцём чырвонаармейцаў ў лягерох.

* 30-га ліпеня зьвярталіся ў лягер лепшыя байцы фізкультурнікі 7-й Самарскай дывізыі імя ангельскага пролетарыяту. Урачыста сустракалі юныя ленінцы байцоў фізкультурнікаў,

* Да піонэрскіх узводаў грузна падкацілі танкі.

З вясёлым сьмехам сустракалі іх піонэры. Пасьля павярхоўнага тлумачэньня аб баявых уласьцівасьцях танкаў, піонэры, пры дапамозе прысутных тут камандзіраў і чырвонармейцаў, началі разьбіраць танк.

* Разьбіраньне і складаньне танка дапоўніла карціну, якую атрымалі піонэры ад гутаркі з камандзірамі аб танках.

* Увечары, калі чырвонармейцы аслабаніліся ад дзённых занятках, быў склікан мітынг усіх піонэраў дэлегатоў і чырвонаармейцаў лягеру. На мітынгу выступаючыя чырвонаармецы яшчэ больш абмалявалі карціну жыцьця Чырвонай арміі, а піонэры расказалі чырвонармейцам, як яны змагаюцца на гаспадарча-культурным фронце за лінію партыі.

* Калі пачало цямнець піонэры-дэлегаты пакінулі чырвонармейскія лягеры.

* * *

* 31-га ліпеня ва унівэрсытэцкім гарадку адбылося заключнае паседжаньне конфэрэнцыі зьлёту.

* Аб выкананьні дагавору піонэраў Беларусі з Наркомземам інформаваў конфэрэнцыю прадстаўнік Наркомзему.

* Па дакладу аб становішчы і далейшых задачах піонэр-організацыі тав. Гайдукевіча і дакладу прадстаўніка НКА тав. Акуліка зацьверджаны рэзолюцыі.

* Ад чэха-славацкай дэлегацыі рабочых зьлёт піонэраў вітаў чэха-славацкі комсамолец.

— Запэўніваю вас, што комсамолія і працоўная моладзь Чэха-Славакіі і надалей будзе змагацца за абарону Савецкага Саюзу.

* Прыняты наказ зьлёту.

* Вечарам у кіно „Культура" адбылося зачыненьне зьлёту. Аб выніках піонэрскай спартакіяды дэлегатам зьлёту далажыў тав. Васьковіч

* Віцебская піонэрыя вуснамі піонэра тав. Аверняга рапартавала зьлёту аб сваіх перамогах. Зьлёт прывіталі рабочыя дэлегацыі з заводу „Бальшавік", фабрыкі „Комунарка"

* На трыбуне — сэкратар ЦК КП(б)Б тав. Гей.

У сваёй прамове тав. Гей зазначае, што піонэры значна дапамаглі партыі ў выкананьні задач, якія ставіць пяцігодка, і прызывае усю піонэрыю Беларусі яшчэ больш змагацца за выкананьне задач, якія ставіць партыя на гаспадарчым і культурным фронце.

* Зьлёт прыняў адозву да ўсіх піонэраў Савецкай Беларусі аб узмацненьні ўвагі навокал задач падрыхтоўкі да новага навучальнага году, політэхнізацыя школ выкананьня прамфінпляну і інш.

* Зьлёт закрыў старшыня ЦБ ДКО тав. Рацэвіч.

* Пасьля зачыненьня зьлёту піонэры-дэлегаты прагледзілі першую пастаноўку новаарганізаванага на Беларусі Тэатру Рабочай Дзетвары—п'есу „На штурме".

Н.

Узьнімаць „Трывогу" разам з комсамоліяй і ўсёй пролетарскай грамадзкасьцю

58 проц. комсамольцаў БССР не ахоплены вайсковай падрыхтоўкай. Гэта—па статыстыцы. Трохсотны комсамольскі колектыў заводу імя Варашылава пядаўна амаль зусім не праводзіў вайсковай падрыхтоўкі. У апошні час пачаліся заняткі сумесна з заводам „Комунар", але яны вельмі рэдкія і ня ўсе зьмены могуць іх наведваць. Каля палловы комсамольцаў не ўладае вінтоўкай.

На заводзе „Дрэваапрацоўшчык", прыкладна, чалавек 10 наведвае вайсковы гурток; на шчотачнай фабрыцы вайсковая падрыхтоўка праводзіцца ад конкурсу да конкурсу па стральбе і г. д. і г. д. Гэта—конкрэтна.

І тое і другое гаворыць шмат аб чым. Зараз, калі пагроза вайны на павестцы дня, калі ня сёньня дык заўтра прыдзецца мерыцца сіламі ў апошнім бai з капіталізмам, не ярпіма такое становішча вайсковай падрыхтоўкі. Пастанова IX-га зьезду УсеЛКСМ аб тым, што кожны комсамолец павінен займацца вайсковай падрыхтоўкай, павінна быць выканана. Перш за ўсё патрэбна, каб кожны комсамолец, малады рабочы, колгасьнік і працоўны селянін ясна ўсьвядоміў, што калі ён сёньня вайскова не падрыхтуецца, ён можа заўтра быць дэзэртырам у нашых баёх з капіталізмам.

І ролю гэтага ўсьведаміцеля павінна больш усяго адыграць мастацтва, шляхам паказу ў тэатры будучай вайны. Мастацкі агітпроп беларускага комсамолу—БелТРАМ улічыў важнасьць гэтай проблемы для комсамолу і ўзяўся за распрацоўку гэтай тэмы. У хуткім часе менская комсамолія ўбачыць „Трывогу" са сцэны беларускага ТРАМ'у.

Аб чым гаворыць „Трывога"?

Яна паказвае комсамольскі колектыў сёньня ў часе соцбудаўніцтва і вайсковай падрыхтоўкі і заўтра—у часе апошняй трывогі. І „сёньня" пастаноўка выкрывае тых, хто зрывае вайсковую падрыхтоўку. Гэта Пятуховы і Лышковы. Яны маюцца, бадай у кожным колектыве. Пятухоў—гэта „пятух", які ня прызнае дробных маштабаў, вайсковай вучобы і інтэрнацыянальнай солідарнасьці. „У выпадку вайны ва ўсіх краінах зараз-жа рэволюцыя—пых—і гатова—няма вайны". Гэта програма Пятуховых у комсамоле. Яны вайсковыя заняткі лічаць дзіцячай гульнёй.

Лышкоў — гэта прымазаўшыся да комсамолу чужак. Ён таксама з „тэорыяй"; „Чакай бабка Пятра—зьясі сыру. Нам у выпадку вайны дапамогі ні адкаго, як нябыло, так і ня будзе". У практычнай рабоце ён таксама правальвае вайсковую і інтэрнацыянальную працу. Ён высокімі прамовамі—„Як мы рэволюцыю рабілі"—хоча прыкрыць сваю варожасьць ідэі абароны Саветаў. Гэта з тых чужакоў, „з сярэдняй адукацыяй", што „вучонасьцю" высоўваюцца ў актыў - ёсьць яшчэ такія ў комсамоле.

Трывога. Апошні бой з капіталізмам. Рэбята ідуць на фронт. Ідуць колгасьнікі. Магутная Чырвоная армія. А з тылу працўніка даносіцца моцны „рот фронт". Цікава расстаноўка клясавых сіл—не географічная, а клясавая. Унутры нас фронт, супроць нас кулакі, нац-дэмы, сэктанты, дробная буржуазія, быўшыя. Па-за нас наш тыл—рабочыя капіталістычных краін, пад сьцягамі компартыі і комсамол.

Лышкоў аказаўся ярым дэзэртырам. Ён схаваўся ў „лагодную шчылінку—да соцыялізму". Пятухоў бяз глузда загінуў ля кулямётаў, бо нямог ім ўладаць. Ён таксама об'ектыўны дэзэртыр. Але ўвесь комсамол—баявы, героічны батальён. Уся Чырвоная армія—неперамо[ж]на. Наша перамога забясьпечана.

У пастаноўцы яшчэ шмат цікавых момантаў: як комсамол працуе ў тыле, як ідзе комунізацыя замежных армій, як важна можа быць веданьне замежных моў, шмат цікавых малюнкаў будучай вайны. „Трывога" здрава бяз панікі, але і не на „ура" ставіць пытаньне вайсковай падрыхтоўкі да будучай вайны, конкрэтна паказваючы, як сёнешнія заняткі заўтра—пытаньне жыцьця Саюзу. „Трывога" мобілізуе комсамол на абарону, пры чым, не адны мі агульнымі разважаньнямі. БелТРАМ унёс у п'есу Кнорэ (Маскоўскі ТРАМ) рад дадаткаў з мясцовага Менскага матар'ялу, што робіць яе яшчэ больш каштоўнай. „Трывога" дае правільную ленінскую канцэпцыю вайны, у процілегласьць шматлікім вайсковым п'есам, якія выходзяць з дробна-буржуазнага пацыфізму, „Трывога" у БелТРАМ'е яшчэ далёка не закончана, ТРАМ не працуе замкнута ў сваіх сьценах.

Каб спэктакль быў найбольш дальнабойным, трэба, каб рабочая моладзь, комсамольскі актыў. Гарком АСО-Авіяхэму, БелАПП зараз прымалі ўдзел у распрацоўцы спэктаклю, уносілі свае корэктывы і дадаткі. Не спэктакль для спэктаклю, а для рашучага павароту комсамолу тварам да абароны краіны. Такая мэта „Трывогі" ТРАМ'у. Усе, каго цікавіць гэтамэта—прыходзь на нараду, склікаемую „Чырвонай Зьменай", Гаркомам комсамолу і БелТРАМ'ам па абгаварэньню „Трывогі".

М. Ю.

Навучальны стукаецца ў дзверы

Да пачатку навучальнага году засталося **29** дзён

Будаўніцтва школ у тэрмін скончыць

Будаўніцтва новых дзесяткаў і соцен школ скончыць у тэрмін. Гэта зьявіцца могутным вагаром у справе далейшага разгортваньня культурнай рэволюцыі ў краіне. Факты з месц б'юць трывогу. У Ветрынскім, Грэскім раёнах бясчынна зрываецца будаўніцтва і рамонт школ.

1-га верасьня блізка. Тэрмін да навучальнага—кароткі. Таму патрэбна ўсім партыйным, комсамольскім організацыям, органам Нарасьветы неадкладна „мобілізаваць усе ўнутраныя рэсурсы, а таксама ўвагу і сродкі грамадзкасьці вакол школьнага будаўніцтва *да першачарговага". Гэтая баявая задача, пастаўленая партыяй, павінна быць у тэрмін выканана.*

Райвыканком зрывае будаўніцтва 9 школ

Становішча школьнага будаўніцтва ў Веткаўскім раёне пад пагрозай зрыву. 9 школ, якія пачалі будавацца ў 1929-30 навучальным годзе, зараз ня будуюцца, бо няма неабходнага будаўнічага матар'ялу, адсутнічае рабочая сіла.

Некаторыя школы, як Рудня,— Гулява, Дубаў-Лог— і інш. у гэтым годзе рабілі спробы будавацца, але райвыканком ня выплаціў рабочым пэнсію і праца спынілася.

Веткаўскі райвыканком і яго старшыня Нартым Блук ніякіх захадаў ня прымае да выкананьня плянаў школьнага будаўніцтва ў раёне. Райвыканком абмяжоўваецца толькі пастановамі.

Грамадзкая думка вакол школьнага будаўніцтва і наогул падрыхтоўкі да навучальнага году не складзена. Грамадзкасьць у будаўніцтве школ і падрыхтоўцы да навучальнага году ня ўдзельнічае.

Неабходна тэрмінова прыняць неабходныя захады, каб у гэтым годзе начатае ў Ветцы будаўніцтва 9 пі чатырохкомплектных школ скончыць. Трэба ўдарыць па зрыўшчыках школьнага будаўніцтва.

Пост „Чыр. Зьмены". С. Ф. С.

Пазбавіце будаўніцтва школы ад опортуністых

У вёсцы Адамава (Грэскі раён) на працягу 3-4 год праводзілася самаабкладаньне для пабудовы школы, але школа ўсё яшчэ не пабудавана.

Сродкі сельсавет часткова скарыстаў на другія патрэбы, частка іх ляжаць нярухома.

Мінулыя гады заняткі праводзіліся ў сялянскай хаце. Гэтая хата ў сучасны момант ня можа зьмясьціць вучняў. Усё гэта сьведчыць аб тым, што новы навучальны год знаходзіцца пад пагрозай зрыву.

Між іншым, вёска колектывізавана на 100 процантаў, і колгасьнікі прасілі Палікарпаўскі сельсавет, каб адпусьцілі кулацкую хату пад школу. Прэзыдыум сельсавету на адным з паседжаньняў, не разабраўшы гэту заяву, адклаў на другі раз.

Адпаведным організацыям неабходна прыняць належныя захады і своечасова падрыхтавацца да новага навучальнага году.

Д. Я.

Праводзім масавую самаправерку баявой гатоўнасьці да ўборкі тэхнічных

Асьвейскі, Бешанковіцкі, Вялыніцкі, Вушацкі, Горацкі, Гарадоцкі, Дрысенскі, Дубровенскі, Крупскі, Лепельскі, Лёзьненскі, Мсьціслаўскі, Полацкі, Расонскі, Сененскі, Сіроцінскі, Сураскі, Талачынскі, Чашніцкі, Чавускі і Шклоўскі

Райкомы КСМ! Памятайце, што пятае жніўня—дзень масавай самаправеркі ў ільнаводных раёнах

Юнкораўскія брыгады, юнкоры ільнаводных раёнаў!

Уключайцеся ў правядзеньне дня самаправеркі. Прымайце актыўны ўдзел у праводзімых „Чырвонай Зьменай" і райкамоламі масавых рэйдах праверкі і іншых мерапрыемствах па правядзеньню дня самаправеркі гатоўнасьці да ўборкі лёну і канапель.

Шлеце матар'ялы аб падрыхтоўцы і правядзеньні самаправеркі рэдакцыі.

* * *

Учора ў Дрысенскі ільнаводны раён выехала ў складзе трох чалавек на час уборкі тэхнічных культур выязная рэдакцыя газэты „Чырвоная Зьмена".

Выехалі таксама ў Лепельскі і Талачынскі ільнаводныя раёны дзьве выязныя брыгады „Ч. З." У бліжэйшыя дні выяжджаюць астатнія брыгады ў раёны, згодна пляну рэйду.

Усебеларуская нарада рэдактароў ільнаводчых раёнаў

Учора ўвечары скончыла сваю работу скліканая культпропам ЦК КП(б)Б Усебеларуская нарада рэдактароў ільнаводных раёнаў БССР.

Апрача рэдактароў раённых газэт у рабоце нарады прынялі ўдзел прадстаўнікі Колгасцэнтру СССР, Галоўленкому, Ільнянопляводбуду (Масква), Наркомзему, Колгасцэнтру, Трактарацэнтру БССР і іншых устаноў і організацый.

Нарада заслухала даклады т. т. Панімятка і Стрэле, а таксама даклады рэдактараў раённых газэт „Колгасьнік Беларусі" (тав. Лебедзеў) „Чырвоная Зьмена", (т. Іткін), Лепельскай і Горацкай раённых газэт (т. т. Мятла і Казлоўскі) аб удзеле гэтых газэт у барацьбе за лён.

На нарадзе таксама быў прапрацаваны прыкладны плян работы раённай газэты ў барацьбе за лён. У спрэчках па дакладах на нарадзе выказаліся 11 асоб.

У бой за мільён тон сілосу

На штурм прарываў у сілосаваньні

Усьлед за Случчынай выступіла Хойніцкая комсамолія

Улічыць памылкі ў тэхніцы сілосаваньня мінулага году



К-цы капаюць траншэі для сілосу

Хойніцкая комсамолія па-баявому выступіла штурмаваць прарывы

З 15 жніўня—эстафэта па выкананьню плянаў сілосаваньня

З мэтай забясьпечыць 100 проц. выкананьне пляну сілосаваньня ў раёне, Хойніцкі РК пастанавіў: правесьці сілосную эстафэту комсамольскай організацыяй.

Парадак правядзеньня ўстаноўлены наступны:

1. З 15—VII па 8—VIII праводзіцца па раёне 2-х дэкаднік сілосаваньня, які ў выніку павінен даць выкананьне пляну сілосаваньня ў колькасьці 64 ям на 1740 тон за кошт розных культур і сарнякоў згодна пляну РКС, падрыхтоўку сілосных ям і траншэй для далейшага сілосаваньня.

2. На працягу 2-х дэкадніка комсамольскія ячэйкі праводзяць практычную работу па сілосаваньню, організуючы брыгады з колгасьнікаў, прыцягваючы аднаасобнікаў на дапамогу колгасам у сілосаваньні праводзячы выхады мясцовых і заводзкіх брыгад на дапамогу колгасам у сілосаваньні. Пры РК праводзіцца нарада ўсіх раённых організацый і спэцыялістых.

3. З 5—VIII па 15—VIII ячэйкі рапартуюць РК аб ходзе работы. Рапарты зачытваюцца на агульным сходзе ячэек з шырокім удзелам беспартыйнай моладзі і колгасьнікаў. На аснове практыкі і недахопаў вызначаецца далейшая работа па сілосаваньню.

4. З 15/VIII—першы тур эстафэты. У гэты дзень райнарада сэкратароў ячэек і ўпаўнаважаных з прадстаўнікоў саўгасаў, колгасаў, грамадзкіх організацый, дзе падводзяцца папярэднія вынікі эстафэты па раёне, зачытваюцца рапарты ячэек і вызначаецца далейшы парадак правядзеньня эстафэты.

5. Для ячэек, якія лепш выконваюць плян сілосаваньня, вызначаюцца прэміі: 1) 6-цітомнік Леніна, 2) „Юны комуністы" на 1 год, 3) „Чырвоная Зьмена" на 1 год.

6. За час да 15 жніўня праводзіцца агляд ня менш 10 ячэек аб іх удзеле ў сілосаваньні. Для дапамогі ячэйкам у правядзеньні эстафэты вылучаны 15 чалавек з раённага актыву.

Сэкратар РК ЛКСМБ Краўчанка.

Улічым вопыт сілосаваньня кармоў 1930 году

Сілосаваньне кармоў у СССР—справа новая. Да гэтага часу мы грунтаваліся на дадзеных Амэрыкі, Нямеччыны і інш. Але за апошнія гады мы маем свой вопыт сілосаваньня. Гэты вопыт нам трэба поўнасьцю ўлічыць у кампаніі сілосаваньня кармоў у 1931 г.

З дасьледаваных у 1931 г. Горацкай Зональнай Станцыяй Малочнай гаспадаркі на БССР 19 сілосных пабудоў (сілосаваньня 1930 г.) ня было ніводнага выпадку абсолютнага псаваньня сілосу. Дасьледаваныя сілосы добра паядаліся жывёлай. Дадзеныя хэмічных аналізаў гэтых сілосаў у асноўным гавораць за добрую якасьць іх.

Сілосаваньне ўтваралася больш у ямках (абліцаваных і неабліцаваных), чым у вежах і траншэях.

Вопыт сілосаваньня кармоў 1930 г. паказаў, што вельмі добры сілос можа быць атрыманы у простай прыватнаванай ямцы, калі грунт раткай, аб (гліністы). Прыкладам можа быць колгас „Таварыш" Горацкага раёну, дзе ў неабліцаванай ямцы атрыманы вельмі добры сілос.

Ва многіх саўгасах і колгасах сілосавалі такія спэцыяльна сілосныя культуры, як кукуруза, сланечнік, віка-аўсяная мешанка, канюшына, (часьцей атава) і інш. Шырока ўжывалася сілосаваньне розных адкідаў: бульбянік, бацьвіньне буракоў, морква, капуснае лісьце розная атава, асака, сьмяцьцёвыя травы і інш. Гэтыя адкіды як паказаў вопыт 1930 г., служаць добрым матар'ялам для сілосаваньня, бо з іх атрыманы вельмі добры корм.

У сілосаваньні 1930 г. былі і недахопы, што, бязумоўна, у гэтую сілосную кампанію трэба зьнішчыць поўнасьцю.

З-за адсутнасьцю паветкі над сілосам і раўчучкоў каля ям, вада з сьнегу і дажджу пападала ў сілос і псавала яго.

І. Л. ...скроў.

(Працяг будзе)

Беспрынцыповыя спрэчкі
адсутнасьць конкрэтнай працы

вось што перашкаджае ліпеньскаму набору ў ФЗВ

Праз 6 дзён скончыць набор

Ліпеньскі набор у ФЗВ на асноўных раёнах Беларусі ўсё яшчэ знаходзіцца ў палоне безадказных спрэчках між гаспадарчымі організацыямі і органамі Наркомпрацы, аб тым, хто павінен што зрабіць, каб забясьпечыць набор у ФЗВ. Аддзел кадраў ВСНГБ у сваёй пастанове аб ліпеньскім наборы адзначыў: „Лічыць недапушчальными адносіны Наркомпрацы да набору у ФЗВ, які ня прымае ніякіх практычных захадаў для забясьпечаньня вызначанай лічбы набору і **нават не зьмяшчае ў газэтах аб'яў аб прыёме**". (Курсіў наш).

Гаспадарчыя аб'яднаньні, якія павінны правесьці ліпеньскі набор у ФЗВ, яшчэ дагэтуль, у поўным аднадушшы з кіраўніцтвам кадраў ВСНГБ, праводзяць „утрыманчую політыку", дасылаюць нарады на патрэбную колькасьць вучняў у органы Наркомпрацы, спадзяючыся, што гэтым набор забясьпечаны.

Органы Наркомпрацы, зусім правільна незгаджаючыся з гэткай устаноўкай гаспадарчых аб'яднаньняў, лічаць сябе не абавязанымі практычна ўдзельнічаць у правядзеньні набору і зводзяць свае функцыі ў ліпеньскім, а таксама і будучым асеньнім наборы, толькі да профтэхнічнага адбору паступаючых.

Толькі ў Віцебску, дзе органы Наркомпрацы знайшлі агульную мову з гаспадарчымі організацыямі і суцольна дапамагаюць адзін аднаму, справа з ліпеньскім наборам знаходзіцца ў больш менш здавальняючым стане.

Адначасова па Менску, Воршы і інш. раёнах справа зрываецца. Пастановай Наркомпрацы ад 26-га чэрвеня, заняткі ліпеньскага набору павінны былі распачацца 15-га ліпеня. На 15-ліпеня па Беларусі ў лік ліпеньскага набору было набрана толькі 20 проц. усёй колькасьці. Выкананьне пастановы ня было забясьпечана конкрэтнай працай.

Загад ВСНГ СССР аб адтэрмінаваньні ліпеньскага набору на два тыдні быў надрукаваны 22-га ліпеня г. г.

Прайшло ўжо 8 дзён з гэтага тэрміну, але належнага зруху ў працы яшчэ няма. У Наркомпрацы нават дакладна ня ведаюць, калі быў выдадзены гэты загад, і калі канчаецца адтэрміноўка. **Наркомпрацы ня ведае, калі павінны распачацца заняткі ліпеньскага набору.**

Наркомпрацы ня ведае сапраўднага стану ходу ліпеньскага набору і таму фактычна ім ня кіруе.

Пастановай Савету Працы і Абароны ад 3-га сакавіка 1931 году былі яскрава вызначаны функцыі органаў працы і гаспадарчых організацый у справе забясьпечаньня народнай гаспадаркі кадрамі. Органы працы павінны ажыцьцяўляць кантроль, пляньаваньне і вышуканьне крыніц для таго, каб задаволіць запатрабаваньне прамысловасьці ў кадрах. Вярбоўка ўскладаецца выключна на гаспадарчыя організацыі і адказнасьць за своечасовы набор нясуць поўнасьцю гаспадарчыя організацыі.

Наркомпрацы, лічачы няправільнай устаноўку гаспадарчых організацый і аддзелу кадраў ВСНГБ, ня выконвае сваіх непасрэдных функцый кантролю і пляньаваньня. У сваю чаргу гаспадарчыя організацыі, ускладаючы асноўную віну за зрыў працы на органы працы, страхуюць сябе.

Ліпеньскі набор у ФЗВ павінен быць праведзены. 8 дзён двухтыднёвіка адтэрмінаваньня ліпеньскага набору ўжо прайшлі. Мы зноў падкрэсьліваем, што праца гэтых двух тыдняў зьяўляецца вымернікам уменьня гаспадарчых організацый аддзелу кадраў ВСНГБ і органаў працы працаваць па-бальшавіцку.

С.

ШУМ, ПАРАДНАСЬЦЬ, ДЭКЛЯРАЦЫІ

Комсамолія Добруша і Уваравіч не забясьпечылі штодзённай опэрацыйнай барацьбы за выкананьне плянаў торпаздабычы

Даць 2000 комсамольцаў, аказаць практычную дапамогу торппрамысловасьці

Зьмешчаныя сяньня матар'ялы аб дапамозе КСМ Уваравіцкага і Гомельскага р-наў у ліквыдацыі прарыву ў тарпяной прамысловасьці сьведчаць аб тым, што гэтыя організацыі ажыцьцяўляюць рашэньні партыйна-савецкіх органаў аб торпарасрацоўках параднай шуміхай, дэкляраціямі і г. д.

А ў гэты час справа мобілізацыі 2000 комсамольцаў на торпазаводы пастаўлена надзвычай дрэнна. Наглядаецца вялікае дэзэртырства (Уваравічы, Асінторп і інш.)

З усёй бальшавіцкай рашучасьцю і настойлівасьцю мы павінны зьнішчыць хваравітыя зьявы ў гэтым напрамку. Паменш шуму, дэкляраций, пабольш практычных спраў. Выканаць кантрольныя лічбы мобілізацыі, замацаваць комсамольцаў да канца пяцігодкі на заводах, падняць на вышэйшую ступень соцспаборніцтва і ўдарніцтва, зьнішчыць ураўнілаўку, абязьлічку, выканаць усе рашэньні партыйна-комсамольскіх і грамадзкіх організацый аб торпараспрацоўках—вось у чым задача.

Ганебная „зводка" дэзэртырства Уваравіцкі РК мабілізаваў 12 чал.

дэзэртыравала 6 ч.

З перадавых позыцый

КОМСАМОЛІЯ ЎЗВАРУШЫЛАСЯ

Выязная брыгада „Чырвонай Зьмены" і „Комсомольской Правды" на Асінторпе

Комсамольская організацыя Асінторпу да гэтага часу ня здолела мобілізавацца на выкананьне прамфінпляну і ліквідацыю прарываў. Тлумачыцца гэта ў значнай меры тым, што партколектыў не дапамагаў комсамольскай організацыі, ня было належнага партыйнага кіраўніцтва ў штодзённай працы комсамолу.

Зараз на завод прыбыло да 1300 чалавек новай рабочай сілы, а прамфінплян, як і раней, выконваецца дрэнна. Так, на 26-VII на машына-формовачнаму торпу плян выкананы на 52 проц., па фрэзэрнаму—на 7,7 проц.

Комсамольская організацыя намеціла рад мерапрыемстваў, якія павінны забясьпечыць рашучы пералом у яе рабоце. Асноўнымі з іх зьяўляюцца:

— 100 проц. ахоп комсамольцаў і рабочай моладзі ўдарніцтвам і соцспаборніцтвам, організацыя абмену вопытам працы паміж лепшымі і адстаючымі брыгадамі, грамадзкі буксір, організацыя ўдарных комсамольска-маладзёжных брыгад, з абавязковым забясьпечаньнем выкананьня імі прамфінпляну.

— На кожным вучастку організуюцца плянава-опэрацыйныя групы і сыгнальныя пасты для дапамогі торпазаводу ў складаньні плянаў другой пяцігодкі Асінторпу, правільнай растаноўкі рабочае сілы, палепшаньня вытворчасьці працы і своечасовай сыгналізацыі аб маючыхся прарывах і недахопах, перашкаджаючых выкананьню прамфінпляну.

— Для выкананьня пастаноў другога пленуму ЦК ЛКСМБ і тэзісаў сэкцыі торпу і энэргетыкі рабсельваенкораўскага зьезду на кожным вучастку ствараецца ня менш як адзін тэхнічны гурток па вывучэньню тэхнічных процэсаў машыны і вытворчасьці працы.

Усе гэтыя мерапрыемствы праводзяцца на падставе давядзеньня да кожнага комсамольца кожнага маладога рабочага пастаноў ЦК КП(б)Б, СНК БССР, пленуму ЦК ЛКСМБ і тэзісаў рабсельваенкораўскага зьезду.

На падставе рэалізацыі ўсіх рашэньняў павінна быць значна палепшана праца па ўцягваньню беспартыйнай моладзі ў КСМ.

Ажыцьцяўленьне ўсіх намечаных мерапрыемстваў можа быць дасягнута толькі пры ўмовах добра наладжанага партыйнага кіраўніцтва, забясьпечаньня конкрэтным опэрацыйным і тэхнічным кіраўніцтвам комсамольска - маладзёжных брыгад, лепшай організацыі і растаноўкі рабочае сілы і поўнага скарыстаньня мэханізмаў.

Міхась Плашчынскі.
Г. Пелей.

Параднасьць, шуміха,—а працы няма

Уваравіцкі райкамол „па-свойму" рэалізуе рашэньні партыйна-комсамольскіх і савецкіх організацый аб рабоце торппрамысловасьці.

Ён павінен мобілізаваць 20 комсамольцаў на торпзаводы, а мобілізаваў толькі 12 чалавек, ды і то шляхам выклікаў праз сакрэтныя пакеты гэтых комсамольцаў у райкамол.

З мобілізаваных 12 чалавек 6 дэзэртавала, а аднаго 14-гадовага хлапчука прышлося адправіць назад.

Каб „аказаць дапамогу", райком 26-га ліпеня правёў пленум, на торпзаводзе „Бальшавік" дзе быў заслуханы даклад аб становішчы заводу.

Было вынесена рашэньне аб мобілізацыі пленуму на два дні для работы на торпзаводзе. А праз некалькі гадзін пасьля гэтага сябры пленуму пачалі дэзэртаваць з заводу (Ясенавец, Краўчанка).

Частка застаўшыхся на працы сымулявала: Катляроў, Пяўцоў, Вільчынкі, Войценка.

ЦК ЛКСМБ павінен перагледзець твар комсамольскага кіраўніцтва Уваравіцкага раёну.

Оргпартгрупа ЦК КП(б)Б
Маўчан, Рэзьнікаў.

К XVII МЮД прысьці з новымі перамогамі у барацьбе за выкананьне 3-га рашаючага за шматмільённы комсамол

У комсамольскіх організацыях шырока разгарнулася работа па падрыхтоўцы да XVII МЮДу. К гэтаму дню комсамольскія ячэйкі і колектывы прыходзяць з новымі, больш высокімі паказчыкамі ўдарнай работы ў выкананьні задач трэцяга рашаючага, у завяршэньні ў асноўным 100 проц. ахопу рабоча-батрацкай моладзі комсамолам.

Апошняя задача выцякае з першай. Барацьба за моладзь—барацьба за выкананьне і перавыкананьне гаспадарчых плянаў.

Аднак, ня ўсе колектывы і ячэйкі ўразумелі гэта: адрываюць гэтыя, так цесна паміж сабою зьвязаныя, пытаньні адно ад другога; устанаўляюць кантрольныя лічбы росту, як зрабіла гэтаЛюдзянівіцкая ячэйка: прымаюць усіх без індывідуальнага адбору, ганяюцца толькі за колькасьцю, не зьвяртаючы ўвагу на якасьць росту.

З гэтымі скажэньнямі рашэньняў зьездаў комсамолу і апошніх пленумаў патрэбна павесьці барацьбу.

Комсамольскі к-ў не павінен быць на апошнім пляне ў рабоце партколектыву

У „Чырвонай Зьмене" ўжо пісалася аб тым, што росту комсамольскага колектыву абутковай фабрыкі перашкаджае тое, што ён яшчэ не перабудаваў сваёй працы ў сувязі з перабудовай працы на фабрыцы.

Комсамольскі колектыў разам з брыгадай Менгаркому комсамолу зьвярнуліся да АПО партыйнага колектыву з просьбай дапамагчы ім перабудавацца, каб выканаць пастанову 2-га пленуму па росту. На гэта яны атрымалі такі адказ: „у нас няма зараз часу перабудоўваць працу комсамольскага колектыву, у нас ёсьць больш важнейшыя справы. Нам трэба ўзмацніць працу па выкананьню прамфінпляну, бо мы за апошні квартал выканалі яго толькі на 86 проц."

Так адказ АПО партколектыву зьяўляецца яўна опортуністычным і блізарукім. Ён забывае, што на фабрыцы працуе больш 50 проц моладзі, што выкананьне прамфінпляну будзе на многа залежаць ад таго, як комсамольскі колектыў разам з астатнімі фабрычнымі організацыямі здолее выканаць рашэньні пленуму ЦК Усе ЛКСМ, завяршыць да XVII МЮД 100 проц. ахоп рабочай моладзі ў КСМ. А гэта патрабуе перабудовы работы комсамольскай організацыі ф-кі.

Гэта і яшчэ рад фактаў сьведчаць аб тым, што з боку партыйнага колектыву існуе яўная недаацэнка ролі і значэньня комсамольскага колектыву. Аб гэтым, нават, сьведчыць такі факт: у месячным каляндарным пляне, складзеным партыйным колектывам, адведзены толькі адзін дзень комсамольскаму колектыву. Ставіцца пытаньне, што можа за адзін дзень у месяц правесьці комсамольскі колектыў?

Тоўсьцік.

Ня гнацца за голай лічбай

Людзянівіцкая ячэйка (Жыткавіцкі р-н) шырока разгарнула работу па падрыхтоўцы да XVII МЮДу. У сваёй пастанове яна вызначыла рад конкрэтных мерапрыемстваў па ўдзелу комсамольцаў у гаспадарчым жыцьці, у грамадзка-політычнай працы і г. д.

Яна ўзяла на сябе рад конкрэтных абавязкаў, напрыклад, да XVII МЮДу выканаць поўнасьцю плян сілосаваньня: у колгасе „Новае жыцьцё" засілосаваць 120 тон, колгасе імя Калініна—120 тон, у колгасе „Ударнік" 25 тон.

Рэалізаваць да МЮДу пазыку „3-га рашаючага" у суме 4500 р.

Аднак, ячэйка дапусьціла грубую памылку, вызначыўшы ў сваёй пастанове такія мерапрыемствы, як уцягненьне ня менш 35 чал. у комсамол, перадачы ў партыю да МЮДу 4 комсамольцаў, уцягнуць у гурткі па ліквідацыі політнягісьменнасьці 10, політшколы 20 чал. і г. д.

Гэтым самым ячэйка падмяняе масавую опэрацыйную работу сярод колгаснай моладзі, уцягненьне яе ва ўсе мерапрыемствы, як гаспадарчыя, так і політычныя, праводзімыя комсамольскай ячэйкай—пагоняй за голай лічбай.

Н.

НЯ СТАЛІ НА ЧАЛЕ

Маладыя ўдарнікі Эльводу (Менск) зразумелі і адгукнуліся на прызыў апошніх пленумаў комсамолу аб завяршэньні 100 проц. ахопу рабоча-батрацкай моладзі комсамолам к XVII МЮД'у. 28 вучняў ФЗВ абвясьцілі сябе ўдарнай комсамольскай брыгадай і ўступілі ў комсамол.

Аднак, бюро комсамольскага колектыву ня здолела выкарыстаць політычнага ўзросту моладзі і цягу яе да комсамолу. Масавая работа сярод моладзі праводзіцца вельмі слаба.

Белагаловін

Тав. Палякову, адбітак „Чырвонай Зьмене"

Менск, 30—УІІ-31 г.

Дзякуючы разгорнутай масавай рабоце, на аснове індывідуальнага адбору, бюро колектыву і цэхячэйкі ЛКСМБ Менскай Школы Вучнёўства МББ чыгункі забясьпечылі выкананьне рашэньня IX зьезду аб акомсамольваньні ФЗВ. Ідучы ў адпачынак, МШВ у асноўным акомсамолены. Наша школа налічвае 463 чал., з іх комсамольцаў 459.

Сэкратар колектыву ЛКСМБ Тарлоўскі.

„Людзі гэстаў" сапсавалі 1000 тон торпу

Гомельскі гаркамол павінен быў мобілізаваць на 5-6 дзён тысячу комсамольцаў і піонэрау на торпзавод „Шлях соцыялізму" для ўборкі фрэзэрнага торпу. Было зафрэзавана каля 1000 тон торпу, які трэба было тэрмінова ўбраць.

Замест таго, каб выслаць на торпзавод 200 фабзавучнікаў Добрускага ФЗВ, 27-га ліпеня раніцай прадстаўнік гаркамолу Зьвездкі і сэкратар колектыву ЛКСМБ Добрускай фабрыкі Казачкоў заставілі фабзайцаў у Добрушы, мотывуючы гэта неабходнасьцю сустракаць піонэраў з Гомелю.

Піонэры ня прыехалі і фабзайцы толькі ўвечары выйшлі на завод. Аднак, дождж замачыў увесь фрэзэрны торп, і ён загінуў.

200 фабзайчат з дапамогай заводу маглі-б убраць больш 1000 тон. Толькі па віне галавацяпаў, „людзей гэстаў", якія супроцьпаставілі торпаздабычы эфэктную сустрэчу піонэраў,—1000 тон торпу прыбіла даждждом. Зараз трэба зноў пускаць фрэзэры.

Гомельскі гарком ЛКСМБ павінен сказаць сваё слова адносна такой „дапамогі" з боку комсамольскай організацыі Добрускай фабрыкі „Герой працы".

Брыгада ЦК КП(б)Б і прокуратуры рэспублікі: Барын, Нускультар, Гарагляд і Лейнаў.

Баявыя заданьні дадзены,

УПЕРАД, ДА НОВЫХ ПЕРАМОГ

Комсамол ільнаводных раёнаў! Заняць перадавыя пазыцыі фронту ўборкі тэхнічных культур

Рэзолюцыя

3-га кантрольнага пленуму ЦК ЛКСМБ па дакладах т. Сапега аб выніках удзелу КСМ—організацыі ў вясновай пасеўкампаніі і задачах на час уборачнай і асеньняй пасеўкампаніі

Пад кіраўніцтвам КП(б)Б комсамольская організацыя Беларусі, у барацьбе за ажыцьцяўленьне задач колектывізацыі сельскай гаспадаркі, рашучай барацьбе з клясавым ворагам і яго агэнтурай у партыі і ў КСМ, атрымала рад рашаючых перамог у справе аказаньня сапраўднай дапамогі партыі ў перавыкананьні наметак колектывізацыі, пляну контрактацыі і ў барацьбе за скарачэньне тэрмінаў севу. Усё гэта яшчэ больш павялічвае ролю і адказнасьць комсамолу, як організуючую ролю колгасных і вясковых ячэек.

Побач з гэтым пленум адзначае, што, не гледзячы на дасягнутыя посьпехі, у працы організацый па рэконструкцыі сельскай гаспадаркі ёсьць рад недахопаў, галоўныя з іх:

а) Яшчэ слаба ажыцьцяўляецца зьдзельшчына і вучот працы ў колгасах. Ня ўсе організацыі ўразумелі, што пытаньні організацыі працы, расстаноўкі рабочай і цяглавай сілы, рацыянальнае скарыстаньне інвэнтара, ажыцьцяўленьне агра-зоотэхнічных і плянавых мерапрыемстваў—ёсьць рашаючай умовай у справе ўмацаваньня існуючых колгасаў і ахопу новых пластоў бядняцка-серадняцкіх гаспадарак колгасамі, насычэньне гаспадарча-палітычных кампаній (вясенні сеў), у выніку чаго ў пасобных раёнах плян засеву застаецца нявыкананым (Уваравіцкі, Ст-Дарожскі, Церахаўскі, Чэрвенскі і інш.). Кіраўніцтва гэтых раённых організацый не забясьпечыла мобілізацыі мас комсамольцаў і моладзі на барацьбу за бальшавіцкія тэмпы севу.

Адабраючы пастанову Чэрвеньскага пленуму ЦК УсеКП(б), ЦК КП(б)Б і УсеЛКСМ, пленум ЦК ЛКСМБ пастанаўляе:

1. У галіне ўборачнай кампаніі:

Задачамі комсамольскай організацыі ў гэтым напрамку павінны быць: пасьпяховае правядзеньне ўборачнай кампаніі ў мінімальна-кароткі тэрмін, з найменшымі затратамі, што патрабуе ад комсамольскай організацыі яшчэ большай мобілізацыі энэргіі мас комсамольцаў, колгасьнікаў, саўгасьнікаў і моладзі на сваечасовую расстаноўку рабочай і цяглавай сілы на ўсіх участках уборачных работ, з максімальным поўнасьцю скарыстаньнем складаных машын;

2. Пленум указвае організацыям на тое, што рашучай умовай для пасьпяховага правядзеньня ўборачнай кампаніі зьяўляецца організацыя працы ў колгасах, разгортваньне соцспаборніцтва і ўдарніцтва, дзеля чаго неабходна:

а) Дабіцца 100 проц. ахопу ўсіх комсамольцаў ударнымі брыгадамі, організаваўшы опэрацыйна-плянавыя групы рацыяналізатараў;

б) Організаваць у час уборачнай кампаніі паміж ячэйкамі, брыгадамі, колгасамі вытворчую пераклічку на хутчэйшае, з меншымі затратамі, правядзеньне ўборачнай кампаніі;

в) Організаваць спэцыяльныя маладзёжныя ўдарныя брыгады, замацаваўшы іх на ўвесь час уборачнай і асеньняй пасеўкампаніі;

г) На справе, да часу ўборачнай кампаніі, дабіцца пераводу на зьдзельшчыну ўсіх колгасаў па ўсіх відах працы, замацаваўшы кожную брыгаду на ўвесь сэзон працы (касьба, жніво і інш.), рашуча змагаючыся з формальным правядзеньнем зьдзельшчыны, расцэньваючы гэта, як спробу сарваць мерапрыемствы партыі па ўмацаваньню колгасаў.

3. Пленум патрабуе да пачатку ўборачнай кампаніі наладзіць сталы вучот выпрацаваных кожным колгасьнікам працадзён, давёўшы да колгасьніка працоўную кніжку і ня менш як адзін раз у 5 дзён запаўняць яе, мобілізаваўшы ўсіх комсамольцаў на практычнае ажыцьцяўленьне пастаноў пленуму ЦК УсеКП(б) аб тым, што „больш таго, без вучоту немагчыма ўмацаваньне колгасу, як буйнай гаспадаркі“.

Для выкананьня гэтага пленум прапануе замацаваць на сталай рабоце па вучоту працы ў колгасах не менш 8.500 комсамольцаў, альбо адпаведна комсамольцам на колгас. Райкомам скончыць гэту работу да 1-VIII-31 г.

4. Праверыць як складаюцца і даводзяцца рабочыя пляны ў колгасах, забясьпечваючы практычны ўдзел у складаньні рабочых пляноў, даваўшы норм выпрацоўкі да кожнага колгасьніка; расстаноўку рабочай сілы і цяглавай сілы, дабіўшыся сапраўднай ліквідацыі абязьлічкі ва ўсіх відах работ праз замацаваньне кожнага колгасьніка за асобным участкам, за асобным інвэнтаром.

5. З мэтай скарыстаць усю рабочую сілу, асабліва жаночую, райкомы і комсамольскія ячэйкі павінны на справе дабіцца організацыі пры колгасах сталых дзіцячых ясель, пляцовак, адначасова організацыю поўнае скарыстаньне наллёткаў, асабліва для ўборкі льна і карнплодаў.

6. Абазначаючы, што саўгасы павінны згуляць кіруючую ролю ва ўборачнай кампаніі, у паказаньне на справе бальшавіцкіх тэмпаў уборкі пры наяўнасьці значнага недахопу у рабсіле ў саўгасах, прапанаваць РК ЛКСМБ у дэкадны тэрмін правесьці пасылку не менш 15.000 комсамольцаў на ўвесь перыяд уборачнай кампаніі ў саўгасы, забясьпечыўшы асобны нагляд за працай у саўгасах. Разам з гэтым РК і ячэйкам правесьці адпаведную работу па складаньні дагавароў соцспаборніцтва ўзаемадапамогі з боку колгасаў, саўгасаў (забясьпечыць сіламі на час уборачнай кампаніі).

7. Абавязаць райкомы і комсамольскія організацыі МТС „неадкладна пераключыць усю практычную дзейнасьць на наступнае:

а) Падрыхтоўку і скончаньне рамонту трактароў, сваечасовую расстаноўку іх па рашаючых участках уборачных работ і асеньняй пасеўкампаніі;

б) Рашучую барацьбу з прастоямі, паставіўшы канкрэтныя і неабходныя ўмовы для кожнага комсамольца-трактарыстага ліквідацыю прарыў, правядзеньне адпаведнай работы за эканомію гаручага і поўную ліквідацыю абязьлічкі на трактарах, ўзяўшы пад асобны нагляд працу с.-г. машын (жняярак, касілак), дабіўшыся поўнай нагрузкі іх работай.

8. Прапанаваць комсамольскім організацыям выканаць пастанову Бюро ЦК ЛКСМБ аб забясьпечаньні с.-г. машынамі на час уборачнай і асеньня-сяўбовай кампаніі. Менскаму Віцебскаму, Гомельскаму ГК, Бабруйскаму РК забясьпечыць поўнае выкананьне прамфінпляну і сваечасовы завоз с.-г. машын у саўгасы і колгасы.

9. Пленум патрабуе ад усіх організацый у час уборачнай кампаніі дабіцца 100 проц. выкананьня пляпаў сілосаваньня. Засілосаваць ня менш мільёна тон сілоснай масы. Дзеля гэтага організацыям неабходна:

а) Да першага жніўня скончыць набудову ям, траншэй і веж, выканаўшы поўнасьцю плянавае заданьне па сілосаваньню на ліпень месяц. У працы жывёлагадоўчых раёнаў, асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на стварэньне кармовай базы, праз правядзеньне двайнога ўкосу заліўных лугоў і інш.

10. Пры наяўнасьці значнай часткі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, пленум указвае організацыям на неабходнасьць аказаць сапраўдную організуючую дапамогу бядняцка-серадняцкім гаспадаркам ва ўборцы ўраджаю с.-г. машынамі, накіраваўшы ўсю работу па ўборцы ў аднаасобным сэктары на ўцягненьне аднаасобнікаў у існуючыя колгасы і організацыю новых колгасных гаспадарак.

11. У адпаведнасьці з задачамі ўборачнай кампаніі, перабудаваць усе формы масавай работы перанёсшы яе ў брыгады, на поле (насценныя газэты, чырвоныя куткі і інш.)

12. Прапанаваць РК ЛКСМБ праверыць стан падрыхтоўкі кадраў для ўборачнай і асеньня-сяўбовай кампаніі, забясьпечыўшы адпаведную колькасьць комсамольцаў і рабочай моладзі ў складзе курсаў.

13. Пленум асабліва патрабуе ад райорганізацый ільнаводных раёнаў, каб яны дабіліся выкананьня наступных задач:

а) Да 1-га верасьня скончыць уборку лёну, разгарнуўшы адпаведную работу за якасьць уборкі, за тое каб усе комсамольцы аўладалі тэхнікай ільнапрацоўчых машын.

б) На справе ажыцьцявіць шэфства над 45 ільназапрацоўчымі заводамі, што будуюцца, забясьпечваючы іх рабсілай, організацыю працы, разгортваньне соцспаборніцтва і ўдарніцтва, бяручы пад асобны нагляд заканчэньне будаўніцтва гэтых заводаў у вызначаны тэрмін.

14. КСМ—організацыям жывёлагадоўчых раёнаў неабходна:

а) разгарнуць работу за аўладаньне агро-зоотэхнікай і сваечасовае ўкомплектаваньне сьвіных і малочных фэрм, дабіўшыся, каб сьвінарнікі былі закончаны будаўніцтвам да вызначанага тэрміну і поўнасьцю выкананы пляны кантрактацыі па жывёлагадоўлю ў кооперацыю.

15. У галіне падрыхтоўкі да асеньня-сяўбовай кампаніі неабходна:

а) Забясьпечыць сваечасовае давядзеньне пляну сеў да кожнага колгасу і аднаасобнага бядняцка-серадняцкай гаспадаркі.

Пленум указвае, што асноўнай задачай організацый на час сяўбовай кампаніі павінна быць барацьба за скарачэньне тэрміну севу, 100 проц. выкананьне пляну севу ў саўгасах, колгасах і аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках, з поўным правядзеньнем агромінімуму.

16. Забясьпечыць у практычнай рабоце КСМ-організацый пасьпяховае правядзеньне ворыва пад зяб, вызначанага па пляну для кожнага саўгасу, колгасу.

17. Пры правядзеньні ўборачнай і асеньня-пасеўнай кампаніі работа комсамольскай організацыі павінна быць цалкам падпарадкавана выкананьню асноўных задач колектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак да канца веснавага севу 32 г. ня менш 75 проц., што патрабуе ад комсамольскай організацыі яшчэ больш непрымірымай барацьбы з опортунізмам усіх колераў, правым, як галоўнай небясьпекай ажыцьцяўляючы пастанову XVI Зьезду УсеКП(б) аб тым, што да канца пяцігодкі колектывізацыя СССР і ліквідацыя кулацтва як клясы на гэтай аснове ў асноўным павінна быць скончана.

18. Пленум прапануе ўсім комсамольскім організацыям уборачную кампанію пераключыць на пасьпяховае правядзеньне хлебанарыхтоўчай кампаніі, мобілізаваўшы ўсю масу комсамольцаў на выкананьне наступных конкрэтных задач:

а) Давядзеньне пляну хлеба нарыхтовак да кожнага колгасу і вёскі, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на поўнае выяўленьне кулацка-заможных гаспадарак і давядзеньне да іх цьвёрдых заданьняў.

б) Сваячасовы абмалот збожжа, рацыянальнае скарыстаньне малатарань, збор тары, праверыўшы падрыхтаванасьць складзкіх памяшканьняў, наладзіўшы сталы нагляд за імі. перамагаючы меўшыя месца ў паасобных колгасах кулацкія настроі: „раней сабе, а потым дзяржаве“; за сваячасовую задачу ўсіх абавязацельстваў і хлебных лішкаў дзяржаве.

19. Прапанаваць КСМ-організацыям забясьпечыць практычны ўздел усёй піонэр-організацыі ва ўборачнай, асеньня-сяўбовай і хлебазагатоўчай кампаніях.

20. Правядзеньне ўборачнай і асеньня-сяўбовай кампаніі павінна быць увязана з пастановай IX зьезду УсеЛКСМ аб організацыі пры кожным колгасе комсамольскіх ячэек і організацыі КСМ ячэек і колектываў у МТС і саўгасах, уцягваючы ў рады КСМ перадавую колгасную моладзь.

Комсамольская ударная брыгада на ўборачнай

Узыходзяць новыя „Ўсходы“

Адзін з 518

Першыя цагліны заложаны тут ня так даўно.

У канцы 1929 году ў Менску на вуліцы Карла Лібкнэхта распачалася ўдарная будова новай скургалянтарэйнай фабрыкі „Ўсход“,— а сёньня гэты двухпавярховы каменны гмах з абсталяванымі 6-мі цэхамі ўваходзіць у шэрагі „518“.

Старая фабрыка „Ўсход“ мела ўсяго два цэхі—скургалянтарэйны і рымарны. У гэтых цэхах працавала 150 чалавек.

Сёньня у новым „Ўсходзе“ працуе 800 чалавек. Фабрыка разьлічана на 1000 з лішнім рабочых.

Усе цэхі, брыгады, групы пераведзены на гаспадарчы разрахунак.

На фабрыцы 11 зьменных цэхпрофкамітэтаў.

У кожным цэху і зьмене комсамольская ячэйка.

Першага жніўня фабрыка перайшла на 7-мі гадзіны рабочы дзень.

З мэтай поўнага ахопу профработай і нагрузкамі рабочых, уся работа праводзіцца ў зьвяне. Зьвяно зьяўляецца асноўнай адзінкай усёй работы.

Прамфінплян за першае паўгодзьдзе выкананы на 100,5 проц. Новая фабрыка павінна даць больш.

З 1-га па 10 жніўня на фабрыцы абвешчаны Сталінскі дэкаднік. На працягу дэкады рабочыя новага „Ўсходу“ узмоцненымі тэмпамі будуць вывучаць і праламляць у жыцьцё прамову тав. Сталіна.

Зараз на „Ўсходзе“, каля тысячы чалавек, а сталоўкі няма, клюбу свайго няма.

Фабрыка пад веданам гарсавету. Гарсавет ня турбуецца забясьпечыць фабрыку сыравінай. Ня цікавяцца пытаньнямі быту на фабрыцы. Ня цікавяцца ростам фабрыкі.

Гарком КП(б)Б вынес пастанову аб перадачы фабрыкі пад ведамства ВСНГБ. Далейшы рост і будаўніцтва новага „Ўсходу“, які уступіў ў шэрагі „518“ першага жніўня, залежыць і ад хутчэйшай перадачы фабрыкі ВСНГБ.

Пад партыйным кіраўніцтвам комсамолія і ўвесь рабочы калектыў на падставе рэалізацыі ўказаньняў т. Сталіна выведуць новы „Ўсход“ у калёну перадавых.

В.

Мітынг прысьвечаны пуску фабрыкі

Рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“

Парткалегія ЦКК КП(б)Б, просіць зьмясьціць наступную папраўку на дакладу конфліктнай камісіі ЦК ЛКСМБ ў пастанове ПК ЦКК КП(б)Б у напрамку барацьбы з хваравітымі зьявішчамі ў КСМ ад 11-VI-31 г.

У III-ім разьдзеле пастановы § д замест „зьвярнуць асаблівую ўвагу на ўсебаковае вывучэньне і чулы падыход да разбору спраў рабочай і батрацкай моладзі, канчаткова ўстанавіўшы практыку разбору справы ў адсутнасьці абвінавачваемага“, —трэба чытаць зьвярнуць асаблівую ўвагу на ўсебаковае вывучэньне і чулы падыход да разбору спраў рабочай і батрацкай моладзі, канчаткова ўстраніўшы практыку разбору справы ў адсутнасьці абвінавачваемага.

Член ПК ЦКК КП(б)Б Пасюкевіч

Паведамленьне

Сёньня, 2-га ліпеня, а 6-ай гадзіне ўвечары, у памяшканьні Гаркому комсамолу адбудзецца інструкцыйная нарада дакладчыкаў, вылучаных для правядзеньня па комсамольскіх колектывах ударнага дня прапрацоўкі 2-га ўсебеларускага зьезду рабселькораў.

На нараду павінны зьявіцца ўсе вылучаныя для гэтай работы дакладчыкі, сьпіс якіх быў зьмешчаны у „Чырвонай зьмене“ ад 28 ліпеня.

Просьба зьявіцца без спазьненьня.

Культпроп гаркому комсамолу.

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.

Друкарня імя тав. Сталіна.

Галоўлітбел № 599